# Гродна атрымае фотапартрэты аўтарства Пятра Шумава



Трыумфальнае вяртанне — менавіта так назвалі госці і арганізатары ўрачыстае адкрыццё фотавыстаўкі знакамітага парыжскага фатографа Пятра Шумава, якое адбылося ў Авальнай зале Новага замка ў Гродне.

Фотамастак нарадзіўся ў Гродне, але лёс яго закінуў далёка за межы нашай краіны. Пётр Шумаў стаў адным з самых вядомых фатографаў Еўропы пачатку XX стагоддзя і асабістым фатографам французскага скульптара Агюста Радэна. На радзіме яго лёс складваўся сумна: вымушаны быў эміграваць з-за сваёй рэвалюцыйнай дзейнасці. Шырокі архіў яго фатаграфій стаў здабыткам Францыі, аднак цяпер жыхары і госці Гродна атрымалі магчымасць убачыць частку спадчыны свайго вядомага земляка, які ў Беларусі быў незаслужана забыты на доўгі час.

Экспазіцыя, што на тры тыдні вярнула на радзіму здымкі фатографа з сусветным імем, адбылася дзякуючы намаганням пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры ЮНЕСКА Паўла Латушкі і кіраўніка гродзенскага фотаклуба Аляксандра Ласмінскага.

— Арганізацыя выстаўкі Пятра Шумава — ганаровая місія, якая дазволіла нам адчуць гонар за нашага земляка, — падкрэслівае Павел Латушка. — Творца вярнуўся праз свае работы дзякуючы дапамозе мецэнатаў, перакананых у значнасці культурнай спадчыны Беларусі, якую трэба вяртаць на радзіму.

Таленавітыя здымкі Пятра Шумава ахапілі ўвесь колер культуры Сярэбранага веку. У 1920-я гады ў аб'ектыў майстра траплялі самыя вядомыя асобы часу: Марк Шагал, Леў Бакст, Уладзімір Маякоўскі, Марына Цвятаева, Альберт Эйнштэйн, Клод Манэ, Ігар Стравінскі, Фёдар Шаляпін і іншыя.

Чорна-белыя фатаграфіі фотамастака даюць уяўленне аб тэхнічных магчымасцях таго часу і доказваюць, які вялікі ўнёсак зрабіў гэты чалавек у сусветную культуру. Пасля заканчэння праекта ў Беларусі застануцца дзве работы майстра — партрэт Льва Бакста і аўтапартрэт.

Вікторыя АСКЕРА